Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 ЛЮТАГА 2017 г. ПЯТНІЦА № 28 (28392)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Семдзесят першае жыццё Таццяны Чардынцавай

СТАР. 5

Што патрэбна дзецям? Бацькі… Ці іх ахвяры?

СТАР. 13

Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:

«У 2016 годзе Гродзенскай вобласці ўдалося зрабіць пэўныя крокі наперад у сацыяльна-эканамічным развіцці. Мы змаглі выканаць і перавыканаць задачы па такіх ключавых напрамках, як экспарт тавараў, прыцягненне прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове, заданне па колькасці працаўладкаваных грамадзян на зноў створаныя працоўныя месцы. Па ўсіх напрамках, па якіх мы зрабілі зрэз за студзень (прамысловасць, сельская гаспадарка і іншыя), бачым станоўчую дынаміку развіцця. Трэба рухацца ў такім тэмпе далей, што дазволіць выканаць намечанае».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 10.02.2017 г.

Долар ЗША	1,9126 ▼
Еўра	2,0437 ▼
Рас. руб.	0,0324 ▲
Укр. грыўня	0,0707 ▼

ISSN 1990 - 763X

На ўсе рукі майстар

Фота БЕЛТА.

29-гадовы магілёвец Арцём Бараноўскі майструе з дзяцінства. У мінулым годзе ён купіў у садовым таварыстве дачу без электрычнасці і вады і сабраў міні-электрастанцыю на сонечных батарэях з асобных пласцін. Цяпер у доме ёсць электрычнасць, якой дастаткова для асвятлення, работы тэлевізара, помпы, газонакасілкі і іншай тэхнікі. Вясной Арцём плануе дадаткова ўсталяваць ветрагенератар, вырабам якога цяпер займаецца, а таксама сабраць міні-трактар для работ на ўчастку.

■ Прамая лінія

УСЁ, ШТО ВЫ ХАЦЕЛІ СПЫТАЦЬ АБ ЖЫЛЛЁВЫМ ЗАКАНАДАЎСТВЕ

Ці можна прадаць кватэру, пабудаваную з дапамогай ільготнага крэдытавання? Як падзяліць асабовыя рахункі? Што рабіць, калі суседзі пастаянна шумяць? Ці магчыма выселіць уласніка з кватэры? Гэтыя і іншыя пытанні можна было задаць на прамой тэлефоннай лініі, што праходзіла ў «Звяздзе». Госцем нашай рэдакцыі была адвакат спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі №3 па прававым забеспячэнні здзелак з нерухомасцю Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Святлана КАСЦЕВІЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Добры дзень! Мяне завуць Таццяна, я з Мінска. У мяне ёсць кватэра, якую мы пабудавалі ў 2008 годзе з дапамогай ільготнага крэдыту. Ці магу я здаваць яе ў арэнду?

— А крэдыт вы пагасілі?

— Яшчэ не да канца.

— Пакуль крэдыт не пагашаны, вы не маеце права здаваць па дагаворы найму гэтую кватэру. У выпадку датэрміновага пагашэння крэдыту вы не зможаце прадаць гэтую кватэру яшчэ на працягу 5 гадоў. Заканадаўства кажа, што купля, продаж, дарэнне, мена альбо іншая здзелка па адчужэнні такой кватэры ажыццяўляецца толькі з дазволу мясцовага выканкама. На здачу кватэры гэтыя абмежаванні не распаўсюджваюцца, гэта значыць, здаваць яе вы зможаце.

(Працяг. Пачатак у «Звяздзе» ад 3 лютага) СТАР. 4

■ Дзейныя асобы

ЧАЛАВЕК-МУЗЕЙ,

ці Як заахвоціць школьнікаў цікавіцца гісторыяй свайго краю

Першае месца на Нараўляншчыне, куды прывозяць усіх высокіх гасцей, — школьны музей. І не адзін, а цэлых пяць. Так склалася, што адну з галоўных славутасцяў раёна сваімі намаганнямі стварыў школьны настаўнік, неабыякавы да мінуўшчыны роднага краю. Ужо больш за тры дзесяцігоддзі ён збірае экспанаты, якія без лішніх слоў змогуць адлюстраваць жыццё пакаленняў, што жылі да нас...

Кіраўнік краязнаўчага гуртка сярэдняй школы №2 Нароўлі, педагог дадатковай адукацыі Васіль ЧАЙКА — ідэйны натхняльнік стварэння музеяў, але не адзін ён ажыццяўляе калісьці задуманае. Разам з вучнямі ён у выхадныя і канікулы ладзіць паходы, вандроўкі па родных мясцінах, ездзіць з дзецьмі на веласіпедах...

Але яго мэта — не наўпрост прайсці ад пункта «А» да кропкі «В», а наведаць разам з падлеткамі малавядомыя мясціны, што таксама маюць уласную, унікальную гісторыю, праз дробязі, праз прыватнае пабачыць тое, што можна назваць «эпохай». А яшчэ паспрабаваць адшукаць прадметы, якія змогуць пасля стаць экспанатамі для ўласнаручна створаных музеяў.

СТАР. 13

ЗЫХОДЗІЦЬ З ЖЫЦЦЁВЫХ РЭАЛІЙ

Прэзідэнт даручыў вырашыць праблемы з перадачай прадпрыемстваў у давернае кіраванне

Учора Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, на якой разглядалася пытанне ўкаранення ў краіне механізма давернага кіравання прадпрыемствамі.

На разгляд Прэзідэнта ўнесены падрыхтаваны ўрадам праект указа аб даверным кіраванні прадпрыемствамі як маёмаснымі комплексамі. «Як мы дамаўляліся, перад прыняццем важных рашэнняў я хацеў бы абмеркаваць гэтыя прапановы. Тым больш, як было заўважана нядаўна, мы вельмі шмат уносім навацый, а потым праз паўгода пачынаем крамсаць праекты заканадаўчых актаў, таму што яны не адпавядаюць патрабаванням сённяшняга жыцця», — цытуе словы Аляксандра Лукашэнкі карэспандэнт БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы ў сувязі з гэтым запатрабаваў далажыць, чым абумоўлена неабходнасць распрацоўкі і прыняцця новага нарматыўна-прававога акта. «Ці можам мы без яго рэгуляваць тыя адносіны, якія ўстанаўліваюцца гэтым указам? — паставіў пытанне беларускі лідар. — Ёсць стратнае або нерэнтабельнае прадпрыемства. Яно працуе дрэнна. Трэба, каб працавала эфектыўна і добра. Дык давайце дадзім права адказным органам улады. Калі гэта сельгаспрадпрыемства, у нас адказваюць губернатары і старшыні райвыканкамаў. Няхай яны вызначацца, як кіраваць гэтым прадпрыемствам».

Аляксандр Лукашэнка таксама перасцярог аб патэнцыяльнай магчымасці злоўжыванняў пры назначэнні розных кіраўнікоў, каб іх дзейнасць на практыцы не ператваралася ў спробы рэйдарскіх захопаў. «Колькі ў нас кіраўнікі выратавалі стратных прадпрыемстваў? Я на сваёй памяці гэтага не помню. Таму мяне хвалюе, ці трэба наогул у гэта ўлазіць?» — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што пры рэгуляванні тых ці іншых працэсаў неабходна зыходзіць з жыццёвых рэалій. У якасці прыкладу ён прывёў дзеючую нарматыўную базу ў адносінах да прадстаўнікоў бізнесу. «Прагучала лічба — каля 2 тыс. актаў рэгулююць узаемаадносіны малога, сярэдняга бізнесу і гэтак далей. Хто іх чытаць будзе?» — падкрэсліў беларускі лідар.

«У нас ёсць уласнік — дзяржава (райвыканкам, аблвыканкам, урад). Давайце кіраваць. Мы кіраўнікоў не можам знайсці нармальных для таго, каб кіраваць прадпрыемствам, а сёння вы знойдзеце дадаткова кіраўнікоў для давернага кіравання, — адзначыў Прэзідэнт. — Няўжо прасцей нельга зрабіць, што будзе зразумела нашым людзям, кіраўнікам».

Старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй Гаеў пасля нарады паведаміў журналістам, што Прэзідэнтам пастаўлена задача аператыўна ўрэгуляваць праблемныя пытанні вакол перадачы ў давернае кіраванне маёмасці ўнітарных прадпрыемстваў. «Як і ў любых пытаннях, па абмяркоўваемай тэме кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на неабходнасць працаваць ад жыцця, не пладзіць непатрэбных дакументаў, а вырашаць пытанні ў рамках прадастаўленых паўнамоцтваў, — сказаў Андрэй Гаеў. — Ёсць момант, які неабходна ўрэгуляваць, — існуе абмежаванне, устаноўленае Грамадзянскім кодэксам, на магчымасць перадачы ў давернае кіраванне маёмасці ўнітарных прадпрыемстваў. Таму па выніках нарады кіраўніком дзяржавы і даручана падрыхтаваць ключавы дакумент, які дазваляе перадаваць у давернае кіраванне маёмасць такіх прадпрыемстваў».

Старшыня Дзяржкаммаёмасці адзначыў, што такі механізм — гэта адзін са спосабаў павышэння эфектыўнасці дзейнасці прадпрыемстваў. Сутнасць у тым, што маёмасць перадаецца ў кіраванне юрыдычнай асобе на пэўны тэрмін. «Юрыдычная асоба, якая бярэ ў кіраванне маёмасны комплекс, атрымлівае магчымасць пашырыць сваю вытворчасць на існуючай базе. Пры гэтым даўгі, калі яны ёсць у прадпрыемства, якое бярэцца ў кіраванне, застаюцца з гэтым прадпрыемствам. Але яно атрымлівае магчымасць выкарыстоўваць сыравіну, матэрыялы, дылерскую сетку юрыдычнай асобы, якая бярэ гэты комплекс у давернае кіраванне», — растлумачыў Андрэй Гаеў.

У выніку ўзнікае станоўчы эканамічны і сацыяльны эфект для абодвух прадпрыемстваў. Даверны кіраўнік прымае на сябе абавязацельствы выводзіць маёмасны комплекс на прыбытковую работу. А па выніках давернага кіравання можа ставіцца пытанне аб яго набыцці.

Андрэй Гаеў паведаміў, што тэарэтычна адпаведны механізм можа быць прыменены адносна больш як 2 тыс. прадпрыемстваў рознага профілю, маёмасць якіх знаходзіцца ў рэспубліканскай і камунальнай уласнасці.

Напярадзе таксама скрупулёзная работа з боку ўрада і мясцовых органаў улады па падборы юрыдычных асоб, якія могуць выступіць у ролі даверных кіраўнікоў. Плануецца, што гэта будзе адбывацца на конкурснай аснове.

«Кіраўнік дзяржавы гаварыў аб тым, што калі існуюць заканадаўча ўстаноўленыя бар'еры, то трэба іх аператыўна знімаць, а далей кожны павінен займацца сваёй справай, не пладзіць залішніх папер», — заявіў старшыня Дзяржкамаёмасці.

Чакаецца, што новаўвядзенні будуць у першую чаргу накіраваны на вырашэнне пытанняў фінансавага аздараўлення прадпрыемстваў і прыцягненне добрасумленных інвестараў. Прэзідэнт даручыў аператыўна без бюракратыі і кручкатворства знайсці аптымальнае рашэнне і ўрэгуляваць абазначаныя праблемныя моманты.

Выбудаваная спартыўная структура — залог поспеху

У Нацыянальным алімпійскім камітэце прайшло пасяджэнне калегіі Міністэрства спорту і турызму. На ім кіраўнікі галіны, федэрацый і трэнеры падвялі вынікі работы ў 2016 годзе і акрэслілі задачы на 2017-ы.

Па выніках пасяджэння Мінспорту былі выдзеленыя асноўныя напрамкі работы: падрыхтоўка да летніх Дэфлімпійскіх гульняў 2017 года, зімовых Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульняў 2018 года, а таксама ведамства паставіла задачу павышэння якасці навуковага забеспячэння, павелічэння заработнай платы ў галіне, узмацнення ролі фізкультурна-масавых мерапрыемстваў і актывізацыі работы па развіцці турыстычнай інфраструктуры.

Асаблівая ўвага была звернута на падрыхтоўку да Еўрапейскіх гульняў, якія плануе будзе прымаць Беларусь у 2019 годзе.

— Уся спартыўная галіна будзе задзейнічана ў гэтым маштабным мерапрыемстве. Нашым супрацоўнікам неабходна вывучаць замежныя мовы, павінна быць павышана інфарматызацыя спартыўных аб'ектаў, якія будуць выкарыстаныя ў ходзе Еўрагульняў, — падкрэсліў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, першы віцэ-прэзідэнт НАК Беларусі Максім РЫЖАНКОЎ.**

Таксама ён заклікаў звярнуць асаблівую ўвагу на падрыхтоўку трэнерскіх кадраў у спартыўных дзіцячаюнацкіх школах і выбудоўванне спартыўнай вертыкалі на раённым узроўні.

— Калі мы не выбудуем спартыўную структуру ў раёнах сёння, заўтра не будзе на каго абаперціся, — адзначыў Максім Уладзіміравіч.

На працу настаўнікаў і спартсменаў, а таксама на іх навучанне пільную ўвагу заклікаў звярнуць і **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Васіль ЖАРКО.** Ён адзначыў, што ў Беларусі створаны выдатныя ўмовы для заняткаў фізічнай культурай і спортам і ад атлетаў павінна быць адпаведная аддача.

— На мой погляд, для дасягнення пастаўленых мэт не хапае павышанай адказнасці кіраўніцтва ў спартыўнай галіне на ўсіх узроўнях. Асабліва вострая тэма — якасць падрыхтоўкі і недахоп трэнераў. Неабходна больш актыўна выкарыстоўваць мэтавую падрыхтоўку, якая забяспечыць спартшколы добрымі спецыялістамі, — сказаў Васіль Жарко.

Акрамя гэтага, на калегіі былі разгледжаны пытанні барацьбы з допінгам, развіцця спартыўнай навукі, эфектыўнасці работы федэрацый па відах спорту і іншыя важныя праблемы спартыўнай галіны.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

■ Грошы

Прэміі за кошт сэканомленых сродкаў

Установлены павышальныя каэфіцыенты да тарыфнай стаўкі для павелічэння заробкаў бюджэтнікаў

Гэта рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 7 лютага №100. Павышальныя каэфіцыенты ўстанаўліваюцца ў гэтым годзе за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, якія ўдалося вызваліць у выніку аптымізацыі структуры і колькасці работнікаў прадпрыемстваў ці сэканоміць у межах бюджэтнага каштарыса расходаў (за выключэннем выдаткаў на аплату камунальных паслуг і капітальных выдаткаў).

Павышальны каэфіцыент прымяняецца да акладу супрацоўнікаў бюджэтных арганізацый для вызначэння дадатковага павелічэння яго заробку. Памер гэтага павелічэння не ўдзельнічае ў фарміраванні тарыфнай стаўкі і не ўлічваецца пры выдачы надбавак, даплат і прэмій.

Канкрэтныя памеры павышальных каэфіцыентаў вызначаюць кіраўнікі бюджэтных прадпрыемстваў і ўстаноў.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Факт

Інфляцыя ў студзені — 0,9%

Спецыялісты Нацыянальнага статыстычнага камітэта паведамляюць, што індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі сёлета ў студзені ў параўнанні са снежнем 2016 года склаў 100,9%.

Эксперты камітэта адзначаюць, што базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, на якія ўплываюць фактары адміністрацыйнага і сезоннага характару, у студзені ў параўнанні са снежнем 2016 года склаў 100,7%. Разам з тым было падлічана, што харчовыя тавары ў першым месяцы года падаражэлі на 1,2% у параўнанні са снежнем і на 10,1% — у параўнанні са студзенем 2016-га. Цэны на нехарчовыя тавары павялічыліся за месяц на 0,8% і 6,3%. Індэкс цэн і тарыфаў на платныя паслугі ў студзені падрос толькі на 0,3% да снежня і на 13,5% — да студзеня 2016 года.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Надвор'е

ХОЛАД АДПУСЦІЦЬ

А на наступным тыдні ўдзень сіноптыкі абяцаюць невялікі плюс

Маразы ў нас пачнуць слабець ужо ў гэтыя выхадныя, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.

У выхадныя мароз пачне губляць свае пазіцыі, будзе больш аблокаў, а вільготнасць паветра павялічыцца. У суботу і нядзелю будзе пераважна без ападкаў, толькі раніцай і ўдзень месцамі на ўсходзе магчымы невялікі кароткачасовы снег. Уначы тэмпература паветра складзе 7—12 марозу, аднак пры праясненнях можа панізіцца да мінус 15 градусаў. Удзень чакаецца ад мінус 3 да мінус 8 градусаў. У панядзелак да нас завітаюць больш вільготныя паветраныя масы і надвор'ем пачне кіраваць зона паніжанага атмасфернага ціску. Будзе воблачна з праясненнямі, пераважна без ападкаў, толькі па ўсходзе краіны пройдзе кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—13 марозу, пры праясненнях — да мінус 15 градусаў. Удзень — ад мінус 2 да мінус 8 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, больш істотнае пацяпленне прыйдзе ў Беларусь у аўторак. Тады пераважна па ўсходзе краіны пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег, у некаторых раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 марозу, але ўдзень будзе ўжо ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла. У сераду стане яшчэ больш камфортна: амаль паўсюдна без ападкаў, але па ўсходзе магчымы невялікі кароткачасовы снег і мокры снег. Тэмпература паветра ўначы складзе толькі 3—10 марозу, а ўдзень будзе сонечна, ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Выбух на АЭС у Францыі адбыўся з-за няспраўнага вентылятара

Аб гэтым заявіў прэфект дэпартамента Манш Жак Віткоўскі. У выніку выбуху ў машыннай зале АЭС «Фламанвіль» на паўночным захадзе Францыі лёгкія атручанні ад задымлення атрымалі пяць чалавек, параненых няма. Мясцовыя ўлады не ўводзілі ў дзеянне план па абароне насельніцтва на выпадак ядзернай аварыі. Работа аднаго з двух рэактараў АЭС спынена пасля выбуху.

Іран абверг запуск балістычнай ракеты

Міністр абароны Ірана Хасейн Дехган абверг паведамленне амерыканскага тэлеканала Fox News аб правядзенні ў краіне новага ракетнага выпрабавання. «Гэтае сцвярджэнне амерыканцаў — фальшыўка. Яе мэта — далейшае нагнятанне іранафобіі і варожасці», — заявіў ён агенцтву Tasnim. Як вядома, Fox News са спасылкай на прадстаўнікоў Пентагона паведаміў, што Іран здзейсніў запуск балістычнай ракеты са стартавай пляцоўкі, размешчанай на ўсход ад Тэгерана. Па даных тэлеканала, з гэтай жа пляцоўкі ў канцы студзеня была запушчана ракета сярэдняй далёкасці.

Пры ўездзе ў Кітай трэба будзе прайсці дактыласкапію

Улады Кітая пачынаюць збіраць адбіткі пальцаў ва ўсіх іншаземцаў, якія прыязджаюць на тэрыторыю краіны, паведамілі ў Міністэрстве грамадскай бяспекі КНР. Новая сістэма спачатку будзе апрабаваная ў міжнародным аэрапорце горада Шэньчжэнь (паўднёвая правінцыя Гуандун). Там яна пачне працаваць з 10 лютага. Да канца гэтага года новую практыку ўвядуць ва ўсіх пунктах перасячэння мяжы.

Японія летась прыняла 28 бежанцаў

Японія ў 2016 годзе прыняла толькі 28 бежанцаў з амаль 11 тысяч чалавек, якія падалі прашэнне аб атрыманні прытулку. Пачынаючы з чэрвеня краіна рэзка паскорыць працэдуру разгляду адпаведных заявак. Міністэрства юстыцыі для паскарэння працэдуры дэлегуе рэгіянальным аддзяленням іміграцыйнай службы свае паўнамоцтвы па разглядзе заявак ад тых, хто хоча атрымаць статус бежанца. Цяпер такія заяўкі разглядае толькі Мінюст. Японію часта папракаюць у закрытасці і ў няўцягнутасці ў праблему бежанцаў у параўнанні з яе партнёрамі па G7. Спакойную рэакцыю выклікалі ў Токіа і ўказы па міграцыйнай палітыцы новага прэзідэнта ЗША Дональда Трампа.

ДРУКАВАНАЕ СЛОВА — МОСТ ПАМІЖ КРАІНАМІ І ЧАСАМІ

На Міжнародным сімпозіуме ў Мінску сустрэліся літаратары з 17 краін

Калі ў адным месцы збіраюцца калегі-пісьменнікі з розных краін свету, можа адбыцца што толькі хочаце — з'явяцца новыя творчыя задумкі, створацца тандэмы аўтараў і перакладчыкаў, пачнецца шматгадовае сяброўства. Так неаднаразова жартам ці ўсур'ёз разважалі самі ўдзельнікі Міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час: 500-годдзе беларускага кнігадрукавання як частка сусветнай кніжнай гісторыі». Пленарнае пасяджэнне гэтага вялікага форуму прайшло ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і сабрала прадстаўнікоў 17 літаратур свету. Арганізатарамі сімпозіума выступілі Міністэрства інфармацыі, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура» і Нацыянальная бібліятэка.

Фота Кастуся ДРОБАВА.

Сапраўды, і для паспяховага развіцця кожнай нацыянальнай літаратуры, і для стварэння агульнай творчай прасторы для розных краін і народаў такія сустрэчы, гутаркі, пагадненні проста неабходныя. Таму Мінск вось ужо трэці раз гасцінна прымае на сімпозіуме паэтаў і празаікаў, даследчыкаў літаратуры і перакладчыкаў, якія прадстаўляюць розныя творчыя традыцыі.

— Вельмі прыемна, што наш сімпозіум прывітаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, — заўважыла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.** — Мы вельмі цэнім тыя літаратурныя кантакты, гуманітарныя праекты, якія рэалізуюцца нашай краінай з іншымі дзяржавамі. Сёлета для нас надзвычай важная дата 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Можна сцвярджаць, што ўнёсак Францыска Скарыны з Полацка — здабытак не толькі нашай краіны. Гэта вялікае свята — яшчэ адна нагода падкрэсліць ролю асоб планетарнага маштабу, якія ёсць у гісторыі кожнай краіны.

Як падкрэсліў **дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, доктар педагагічных навук Раман МАТУЛЬСКІ**, Скарына ў свой час быў чалавекам свету. На карце тагачаснай Еўропы можна адзначыць мноства гарадоў, так ці інакш звязаных з яго лёсам і справамі. Таму цалкам лагічна, што і сёння слова нашага першадрукара, яго постаць яднае многія краіны і народы.

Сімвалічна, што беларуская зямля вось ужо шмат гадоў з'яўляецца выдатнай пляцоўкай для сустрэч літаратараў. Варта згадаць міжнародныя круглыя сталы, якія ўжо на працягу дзесяцігоддзя праходзяць падчас святкавання Дня беларускага пісьменства, штогадовыя кніжныя кірмашы ў беларускай сталіцы і — новы значны крок супрацоўніцтва — сімпозіумы літаратараў. Як адзначыў **пісьменнік з Кітая Шы ІФЭН**, вельмі часта, фарміруючы сваё ўяўленне пра чалавека, народ і цэлую краіну, мы кіруемся ўжо складзенымі стэрэатыпамі. Але ж важна самому пазнаёміцца з культурай, пабачыць усё на свае вочы.

Відавочна, што ўдзел замежных аўтараў у беларускіх міжнародных праектах — выдатная нагода найперш пабываць у нашай краіне, паглядзець, як і чым жывуць іх калегі тут. А ўжо потым — з першых вуснаў расказваць пра нас свету.

Таму не выпадкова многія літаратары ў сваіх выступленнях гаварылі пра адказнасць пісьменніка перад сваімі сучаснікамі і будучымі пакаленнямі, інтэрпрэтавалі тэму «Пісьменнік і час» праз прызму ўласнага ўспрымання масткоў паміж мінулым і будучыняй. **Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ** заўважыў: «Падчас такіх сустрэч мы можам разважаць пра многае — літаратуру, мастацтва, адметнасці нашага часу. Літаратура — стрыжань у адносінах паміж краінамі і дзяржавамі. Час сёння нялёгкі, але варта памятаць, што ад нас, творцаў, залежыць многае, трэба толькі не саромецца гучна выказваць свае думкі, і іх пачуюць».

З якім настроем завіталі да нас госці з розных краін? Якія ўражанні павязуць на радзіму? Гэтыя пытанні мы задалі замежным удзельнікам сімпозіума. Некаторыя з іх з'яўляюцца добрымі сябрамі Беларусі, а некаторыя завіталі ў Мінск упершыню.

Марат АХМЕДЖАНАЎ, дырэктар выдавецтва Hertfordshire Press, Вялікабрытанія:

— Летась я прымаў удзел у святкаванні Дня беларускага пісьменства ў Рагачове, атрымаў вялікае задавальненне ад знаёмства з беларускай культурай, выдавецкай справай вашай краіны. Я быў здзіўлены ўзроўнем развіцця беларускай літаратуры і тым, наколькі моцна дзяржава падтрымлівае нацыянальных аўтараў. На Захадзе, асабліва ў Вялікабрытаніі, мы маем вельмі слабую падтрымку дзяржавы, уся літаратура пабудавана на камерцыйным падмурку. На жаль, праз гэта ў Вялікабрытаніі пра беларускіх аўтараў ведаюць вельмі мала. Таму я і працую — каб знайсці тут тых творцаў, якія пішуць высокамастацкія вершы і прозу і могуць быць камерцыйна паспяховымі.

Марка ВЕСКАВІЧ, старшы саветнік Міністэрства культуры і інфармацыі Сербіі:

— Урачыстае адкрыццё Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, святкаванне 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і сённяшняе пленарнае пасяджэнне сімпозіума літаратараў яшчэ раз даказваюць, што ў Беларусі кніга — важны элемент культуры, важны аспект жыцця сучаснага грамадства. Відаць, што традыцыя пісьменніцтва, кнігадрукавання тут вельмі даўняя.

Касім БУХГІА, пісьменнік, літаратуразнаўца, прэзідэнт Пакістанскай акадэміі літаратуры:

— Я вельмі рады быць тут, сустрэцца з беларусамі і прадстаўнікамі іншых краін. На сімпозіуме я даведаўся, што беларускае кнігадрукаванне мае 500-гадовую гісторыю. Гэта вялікі вопыт і вялікія веды, прадстаўленыя ў калекцыі старажытных кніг і манускрыптаў. Не так даўно Пакістанская акадэмія літаратуры падпісала пагадненне аб супрацоўніцтве з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. І ў межах гэтага пагаднення ўжо адбываецца абмен перакладнымі творамі.

Сімпозіум літаратараў — гэта не толькі дыялог літаратур, краін і культур, гэта яшчэ і дыялог пакаленняў творцаў. Таму не выпадкова чарговы раз у межах вялікага форуму прайшоў семінар маладых літаратараў, пэўнага кшталту школа для пачаткоўцаў, якая дала магчымасць пабачыць, пачуць і навучыцца новаму ў старэйшых калег. Таму можна быць упэўненымі, што Мінскі фармат сустрэч, які спрыяе наладжванню дыялогу, будзе актуальны яшчэ многія гады.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

■ Закон у дапамогу

ХТО Ў РЭЕСТРЫ ДАЎЖНІКОЎ?

Правы патрабавальнікаў і судовых выканаўцаў пашырацца

Паэтапны пераход да цалкам электроннага дакументаабароту пры правядзенні абавязковай юрыдычнай экспертызы ведамасных актаў, а таксама прыняцце двух законаў аб прымусовым выкананні — гэта адны з найважнейшых падзей мінулага года ў працы міністэрства, зазначыў міністр юстыцыі Беларусі Алег СЛІЖЭЎСКІ.

— Важны для нас накірунак — дзейнасць органаў прымусовага выканання. У 2016 годзе яны спагналі 1,6 млрд дэнамінаваных беларускіх рублёў, што амаль у два разы больш, чым у 2015-м, — расказаў міністр. — Для зніжэння нагрузкі на судовых выканаўцаў карэктуецца заканадаўства і ствараюцца неабходныя арганізацыйныя ўмовы. Перш за ўсё гэта ўкараненне інфармацыйных тэхналогій у дзейнасць органаў прымусовага выканання. У нарматыўным плане мы ўскладаем сур'ёзныя надзеі на законы аб судовых выканаўцах і прымусовым выкананні, якія запрацуюць у маі.

Адно з новаўвядзенняў прынятых у 2016 годзе законаў — заяўны прынцып завядзення выканаўчай вытворчасці, калі справа будзе распачынацца пры наяўнасці заявы патрабавальніка. Выключэнні датычацца выпадкаў, калі дакументы накіроўваюцца судом у частцы маёмасных спагнанняў па крымінальных справах і аб адміністрацыйных правапарушэннях.

З мая патрабавальнік доўгу зможа самастойна, без судовага выканаўцы, накіроўваць выканаўчы дакумент па месцы працы даўжніка, калі сума доўгу не перавышае 10 базавых велічынь.

Пашырацца правы судовых выканаўцаў: ім будзе дазволена самастойна замяняць бок прымусовага выканання, выносіць пастанову аб прыводзе ці затрыманні даўжніка (пакуль гэта могуць рабіць толькі суддзі), аб'яўляць неплацельшчыка ў пошук і здзяйсняць шэраг іншых паўнамоцтваў.

— Прадугледжана стварэнне і вядзенне банка даных прымусовых выкананняў. Рэестр даўжнікоў ужо працуе, праўда, пакуль што не ў тым фармаце, які мы чакаем. У далейшым плануецца, што бакі прымусовага выканання змогуць ствараць у рэестры свой асабісты кабінет, праз які патрабавальнік будзе сачыць за дзеяннямі судовага выканаўцы па спагнанні доўгу, — дадаў міністр.

Нарматворчыя органы на працягу 2016 года прадстаўлялі акты на экспертызу ў папяровым і электронным варыянтах. Сёлета з 1 студзеня пры юрыдычнай экспертызе рашэнняў міністэрстваў, абласных выканкамаў і Саветаў дэпутатаў папяровыя носьбіты з дакументаабароту выключаны.

Ірына СІДАРОК.
sidarok@zviazda.by

■ Сакрэты поспеху

Як прасунуцца ў сусветных рэйтынгах?

Па апошніх звестках, у рэйтынгу лепшых універсітэтаў свету Webometrics (Webometrics Ranking of World Universities) Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт размясціўся на 637-й пазіцыі. Сярод універсітэтаў краін — удзельніц СНД ён займае чацвёртае месца. Першае ўтрымлівае Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М.В. Ламаносава (216-е месца ў сусветным рэйтынгу). За ім ідуць Санкт-Пецярбургскі (526-е) і Новасібірскі дзяржаўныя ўніверсітэты (548-е).

Усяго ў рэйтынгу Webometrics ранжыруюцца больш як 22 тысячы ўстаноў вышэйшай адукацыі з 30 тысяч, што існуюць. Яго вынікі публікуюцца двойчы на год. БДУ дэманструе ўстойлівасць сваіх пазіцый у гэтым рэйтынгу на працягу апошніх некалькіх гадоў, уваходзячы ў 2—3% найлепшых універсітэтаў свету. А сярод беларускіх ВНУ Белдзяржуніверсітэт стабільна захоўвае першынство. У БНТУ — толькі 2891-ы радок, у іншых беларускіх ВНУ яшчэ больш сціплыя пазіцыі. А на вяршыні Webometrics па традыцыі размясціліся Гарвардскі, Стэнфардскі ўніверсітэты і Масачусецкі тэхналагічны інстытут.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■

УСЁ, ШТО ВЫ ХАЦЕЛІ СПЫТАЦЬ АБ ЖЫЛЛЁВЫМ ЗАКАНАДАЎСТВЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Не мае значэння, на суткі я буду здаваць або на працяглы тэрмін?

— Калі вы хочаце здаваць кватэру на суткі, трэба будзе зарэгістравацца ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка і плаціць адпаведны падатак. А калі будзеце здаваць кватэру як фізасоба іншай фізічнай асобе, вы павінны будзеце заключыць дагавор найму і зарэгістраваць яго ў выканкаме.

***

— Мяне завуць Бальшакова Веранікa Сяргееўна, я з Гродзенскай вобласці вам тэлефаную. Справа ў тым, што я з'яўляюся ўласнікам 1/2 долі ў прыватызаванай кватэры. Уласнікам другой 1/2 долі з'яўляецца мой брат. Кватэра двухпакаёвая. Я хацела б аплачваць камунальныя паслугі асобна, а таксама каб мне вызначылі ў карыстанне адзін з пакояў. Што я павінна зрабіць для гэтага? І як быць у выпадку, калі брат не захоча вырашаць гэтае пытанне добраахвотна? Неабходна падаваць іскавую заяву ў суд? Як правільна падзяліць асабовыя рахункі на аплату паслуг?

— Калі дасягняце з братам згоды, вы можаце звярнуцца ў ЖЭС па месцы знаходжання кватэры і заключыць пісьмовае пагадненне аб парадку карыстання кватэрай.

У выпадку, калі такой згоды не будзе, вам давядзецца падаць заяву ў суд аб падзеле жылога памяшкання з просьбай выдзеліць вам ва ўласнасць асобны пакой. Месцы агульнага карыстання пры гэтым застануцца ў долевай уласнасці. На падставе рашэння суда асабовы рахунак на кватэру будзе падзелены.

***

— Мяне завуць Вольга, я жыву ў Мінску. Днямі пагасіла льготны крэдыт, які мы атрымалі 10 гадоў таму як шматдзетная сям'я. Крэдыт быў дадзены на 40 гадоў. Скажыце, калі я змагу распараджацца гэтай кватэрай, напрыклад, падарыць яе сыну або палепшыць жыллёвыя ўмовы, абмяняўшы на большую з даплатай?

— На працягу 5 гадоў вы можаце прадаць кватэру толькі мясцоваму заканадаўча-распарадчаму органу. Але калі будуць нейкія выключныя прычыны, як, напрыклад, пераезд у іншую мясцовасць, скасаванне шлюбу, смерць уласніка жылога памяшкання і інш., або ў выпадку паляпшэння жыллёвых умоў шляхам будаўніцтва ці набыцця жылога памяшкання мясцовы выканкам можа выдаць дазвол на здзяйсненне такой здзелкі. Гэта значыць, падарыць дадзеную кватэру вы можаце толькі з дазволу мясцовага выканкама, даказаўшы важкую прычыну. Калі ж вы захочаце палепшыць жыллёвыя ўмовы як уласнік, выканкам павінен даць вам дазвол на адчужэнне кватэры.

— Значыць, я павінна папярэдне заключыць дагавор аб куплі большай кватэры, потым прынесці і паказаць яго выканкаму?

— Так, і гэта будзе дазвол на куплю той канкрэтнай кватэры, на якую вы папярэдне заключылі дагавор. Але калі вы знайшлі адну кватэру, заключылі дагавор на яе куплю, вам далі дазвол, а вы вырашылі купіць потым другую кватэру, то гэтага вы зрабіць не зможаце...

***

— Добры дзень! Мяне завуць Ліна Іванаўна Нагорная, з Любані тэлефаную. Я пражываю ў пяціпавярховым доме. У нашым пад'ездзе 15 кватэр, ёсць маленькія дзеці. Скажыце, як правільна рабіць рамонт, каб не перашкаджаць суседзям? Калі я магу стукаць, свідраваць і г.д.?

— Ліна Іванаўна, у нашай краіне дзейнічае Палажэнне аб умовах і парадку перабудовы і (або) перапланіроўкі, зацверджанае пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 16.05.2013 г. № 384. Згодна з ім у перыяд правядзення пераўладкавання і (або) перапланіроўкі ў шматкватэрных і блакіраваных жылых дамах забараняецца:

— здзяйсняць у выхадныя і святочныя дні работы па пераўладкаванні і (або) перапланіроўцы, якія ствараюць шум або вібрацыю, а таксама пачынаць такія работы раней за 9 гадзін і заканчваць іх пазней за 19 гадзін у працоўныя дні. Такім чынам, у названыя дні і час вы абавязаны забяспечваць цішыню. А ў астатні час спакойна займайцеся рамонтам, вы маеце на гэта права.

***

— З Маладзечна вас турбуюць, мяне завуць Ірына Алегаўна. Мы з маці прыватызавалі ўдзвюх кватэру. Мая сястра ў прыватызацыі не ўдзельнічала і выпісана. Ці мае яна права на кватэру, на маю долю або долю маці? Ці можа яна пасля смерці маці аспрэчыць яе долю?

— У гэтым канкрэтным выпадку ваша сястра не мае правоў на прыватызаваную кватэру. Пытанне аб аспрэчванні долі пасля смерці маці некарэктнае, мяркую, вы маеце на ўвазе атрыманне ў спадчыну долі. У гэтым выпадку яна, як спадчыннік першай чаргі, мае права прэтэндаваць на частку долі пры атрыманні ў спадчыну па законе.

***

— Суседзі здалі сваю кватэру на працяглы тэрмін, але кватаранты аказаліся вельмі шумнымі, не даюць начамі спаць. Гаварылі пра гэта гаспадарам кватэры, але толку ніякага. Апошнім часам яны нават не падымаюць тэлефонную трубку. Што рабіць? Няўжо няма ніякага спосабу пакараць такіх жыхароў (або гаспадароў кватэры)? (А.С., Мінскі р-н, пытанне зададзена па электроннай пошце.)

— З 23 і да 7 гадзін не павінны адбывацца дзеянні, якія ствараюць вібрацыю і шум (у тым ліку шляхам ігры на музычных інструментах, гучных размоў і спеваў, прымянення піратэхнічных сродкаў, выканання бытавых (рамонтных) работ, правядзення ручных пагрузачна-разгрузачных работ, рэзкага закрыцця дзвярэй, утрымання свойскіх жывёл і іншых дзеянняў. (Гэта п. 7 Правілаў карыстання жылымі памяшканнямі, утрымання жылых і дапаможных памяшканняў, зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21.05.2013 г. №399). Таму, калі за сценкай начамі шумяць, вы можаце звярнуцца ў праваахоўныя органы па абароне сваіх правоў.

***

— Добры дзень! Гэта Смык Валянціна з Бабруйска. Я развялася з мужам, у судовым парадку падзялілі кватэру. Асабовыя рахункі я таксама падзяліла. Праблема заключаецца ў тым, што ён не плаціць па лічыльніках. Я штомесяц аплачваю палову. За нявыплату яго паловы налічваецца пеня. Як мне быць у такой сітуацыі?

— Абавязак па выплаце пені ў гэтым выпадку ўскладаецца на былога мужа. Таксама, згодна з арт. 155 Жыллёвага кодэкса, калі ўласнік кватэры мае без важкіх прычын шасцімесячную запазычанасць па аплаце за жыллёва-камунальныя паслугі, мясцовы выканкам абавязаны ў пісьмовай форме папярэдзіць яго аб неабходнасці пагасіць запазычанасць.

Калі ўласнік на працягу аднаго месяца з даты атрымання папярэджання не пагасіў запазычанасці па аплаце за жыллёва-камунальныя паслугі ў поўным аб'ёме, а магчымасці пагашэння доўгу за кошт яго маёмасці няма, мясцовы выканкам мае права падаць іск у суд аб прымушэнні ўласніка кватэры да яе адчужэння.

Такім чынам, пры наяўнасці названых вышэй абставін частка кватэры, якая належыць вашаму былому мужу, можа быць прададзеная з публічных таргоў.

***

— Маё пытанне датычыцца чэкаў «Жыллё». У мяне ва ўласнасці знаходзіцца дом у Мінску. Гэты дом у стадыі рэканструкцыі (летась атрыманы ўсе адпаведныя дазволы ў адміністрацыі). Мая маці хоча аформіць дагавор дарэння на чэкі «Жыллё» і аддаць іх мне. Я нядаўна ажаніўся, і мы з жонкай збіраемся стаць на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў як маладая сям'я. Ці змагу я скарыстацца чэкамі «Жыллё», каб завяршыць рэканструкцыю свайго дома (купіць вокны, усталяваць камунікацыі і г.д.), бо дом знаходзіцца ў стадыі незавершанага будаўніцтва (рэканструкцыі). (Валерый Бурачонак, па электроннай пошце.)

— Згодна з арт.143 Жыллёвага кодэкса імянныя прыватызацыйныя чэкі «Жыллё» выкарыстоўваюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь для прыватызацыі займаных імі жылых памяшканняў дзяржаўнага жылфонду, а таксама грамадзянамі і членамі іх сем'яў, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, для выплаты паявога ўзносу ў жыллёвым або жыллёва-будаўнічым кааператыве, фінансавання індывідуальнага або калектыўнага жыллёвага будаўніцтва; рэканструкцыі блакіраваных, аднакватэрных жылых дамоў; долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве, набыцця жылых памяшканняў шляхам куплі, пагашэння запазычанасці па крэдытах банкаў (уключаючы выплату працэнтаў за карыстанне імі) і пазыках арганізацый, узятых і выкарыстаных на названыя мэты.

Імянныя прыватызацыйныя чэкі «Жыллё» не падлягаюць адчужэнню за выключэннем дарэння іх па натарыяльна засведчаным дагаворы мужу (жонцы), бацькам, дзецям, усынавіцелям (удачарыцелям), усыноўленым, родным братам і сёстрам, дзеду, бабулі, унукам, пераходу права ўласнасці ў спадчыну або па рашэнні суда.

У выпадку рэканструкцыі вамі блакіраванага, аднакватэрнага жылога дома, пры тым што вы стаіце на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, вы можаце скарыстацца чэкамі «Жыллё», падоранымі вам вашай маці па натарыяльна засведчаным дагаворы.

***

— Добры дзень! Гэта Вольга Мікалаеўна з Мінска. Я з сям'ёй (я, муж і дачка) пражываем у кватэры, набытай па льготным крэдыце. Крэдыт да снежня 2028 года. З мужам я 3 гады ў разводзе. У кватэры прапісаныя толькі мы з дачкой. Былы муж прапісаны ў іншай кватэры (яна ў яго ў прыватнай уласнасці). Сыходзіць ён не хоча, абражае мяне і пагражае. Крэдыт аформлены на мяне, выплачваю яго я. Ці ёсць у мяне шанц прадаць гэтую кватэру, каб мы маглі раз'ехацца?

— Вольга Мікалаеўна, згодна з дзейным заканадаўствам да поўнага пагашэння льготнага крэдыту продаж жылога памяшкання, пабудаванага з яго прыцягненнем, забаронены, у сувязі з чым вы, на жаль, не зможаце здзейсніць гэтую здзелку.

***

— У 1992 годзе муж з'ехаў даглядаць маці і прапісаўся ў яе доме. Маці памерла ў тым жа годзе і не пакінула завяшчання. Цяпер у гэтым доме жыве наша сям'я (з 1992 г.) — гэта значыць мой 81-гадовы муж (інвалід 1 групы), сын (1987 г.н., інвалід з дзяцінства) і я. Яны прапісаны ў гэтым доме, я прапісаная ў Вілейцы. У 2014 годзе сястра мужа аформіла завяшчанне на гэты дом (зарэгістравала) на свайго сына. Нам старшыня сельсавета сказаў, што яно несапраўднае, таму што няма подпісу маці. Тым не менш цяпер гэты дом сястра мужа хоча прадаць. Ці мае яна права выселіць нашу сям'ю? (Юркевіч Ванда Пятроўна, Вілейскі р-н, в. Жары, пытанне зададзена папярэдне.)

— У выпадку наяўнасці сумненняў у сапраўднасці завяшчання вы маеце права аспрэчваць яго ў судовым парадку. Разам з тым паўналетнія члены сям'і ўласніка жылога памяшкання, якія пражываюць сумесна з ім і якія не маюць долі ў праве агульнай уласнасці на гэтае жылое памяшканне, падлягаюць высяленню па патрабаванні ўласніка ў іншае жылое памяшканне, якое належыць ім альбо ўласніку на праве ўласнасці ў дадзеным населеным пункце і адпавядае ўстаноўленым для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням, у сувязі з чым вашу сям'ю могуць выселіць у іншае жылое памяшканне.

(Поўную версію прамой лініі чытайце на нашым сайце http://zviazda.by.)

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

■ Прававая гасцёўня

Дзіця зарэгіструюць усюды, дзе жывуць яго бацькі, — бясплатна і без згоды ўласніка памяшкання

— Мы з мужам прапісаны і жывём у інтэрнаце ад яго работы. Гэта інтэрнат сямейнага тыпу, у нас асобны блок. Нядаўна нарадзілася дзіця. Ці можам мы зарэгістраваць яго па месцы нашага жыхарства? Куды для гэтага трэба звярнуцца і якія прадставіць дакументы? Калі малога можна будзе зарэгістраваць у іншай кватэры, асобна ад нас?

Маргарыта Мятліцкая, *Гомельская вобласць.*

На пытанне адказвае Надзея МАЎЧУН, намеснік начальніка ўпраўлення прававога рэгулявання сацыяльнай дзейнасці дзяржавы галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі:

— Несумненна, вы маеце права зарэгістраваць дзіця па месцы свайго пражывання. Згодна з пунктам 29 Палажэння аб інтэрнатах (зацверджанага пастановай Савета Міністраў Беларусі ад 5 красавіка 2013 года № 269) наймальнік, які займае ізаляванае жылое памяшканне ў інтэрнаце, якое прызначана для пражывання сем'яў і знаходзіцца ў іх адасобленым валоданні і карыстанні, мае права прадастаўляць гэтую плошчу ва ўладанне і карыстанне сваім непаўналетнім дзецям, якія не маюць ва ўласнасці і (ці) уладанні і карыстанні жылых памяшканняў у гэтым населеным пункце.

Хачу нагадаць, што рэгістрацыя па месцы жыхарства не з'яўляецца падставай для ўзнікнення права валодання і карыстання жылым памяшканнем (артыкул 23 Жыллёвага кодэкса Беларусі). Такім правам непаўналетнія дзеці наймальніка памяшкання ў інтэрнаце надзяляюцца толькі са згоды адміністрацыі арганізацыі, у распараджэнні якой знаходзіцца інтэрнат, і прафсаюзнага камітэта (пры яго наяўнасці).

Пытанні рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання рэгулююцца Палажэннем аб рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання, зацверджаным Указам Прэзідэнта Беларусі ад 7 верасня 2007 г. № 413 «Аб удасканаленні сістэмы ўліку грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання» (далей — Палажэнне аб рэгістрацыі).

Дзеці, якія не дасягнулі чатырнаццацігадовага ўзросту, рэгіструюцца па месцы жыхарства або месцы знаходжання іх бацькоў (законных прадстаўнікоў) ці аднаго з іх са згоды другога або па рашэнні суда, якім вызначаецца, з кім з законных прадстаўнікоў будуць пражываць малыя.

Непаўналетніх ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў таксама можна зарэгістраваць па месцы жыхарства іх бацькоў ці аднаго з іх са згоды другога або па рашэнні суда, якім вызначаецца, з кім будуць пражываць малыя. Аднак пасля 14 гадоў непаўналетняга (са згоды яго прадстаўнікоў) можна зарэгістраваць не па месцы жыхарства бацькоў.

Каб зарэгістраваць дзіця па месцы жыхарства ці месцы знаходжання яго прадстаўнікоў ці аднаго з іх, не патрабуецца згода ўласніка (наймальніка) жылога памяшкання і паўналетніх членаў яго сям'і, якія маюць права карыстання гэтай плошчай. Адпаведна з падпунктам 3.4 пункта 3 названага Указа непаўналетнія вызваляюцца ад выплаты дзяржаўнай пошліны за рэгістрацыю па месцы жыхарства або месцы знаходжання.

Дакументы для рэгістрацыі дзіцяці па месцы жыхарства вы павінны прадставіць асобе, адказнай за рэгістрацыю, у арганізацыі, што распараджаецца інтэрнатам.

Вам спатрэбяцца:

заява аб рэгістрацыі па месцы жыхарства ўстаноўленай формы;

дакумент, які пацвярджае асобу (пасведчанне аб нараджэнні);

пісьмовая згода аднаго з законных прадстаўнікоў непаўналетняга на яго рэгістрацыю па месцы жыхарства другога законнага прадстаўніка, якая засведчана асобай, адказнай за рэгістрацыю.

Звяртаю вашу ўвагу, што, згодна з пунктам 7 Палажэння аб рэгістрацыі непаўналетні павінен быць зарэгістраваны бацькамі па месцы жыхарства не пазней аднаго месяца з дня рэгістрацыі нараджэння або з дня прыбыцця на новае месца жыхарства.

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста мы будзем шукаць на іх адказы.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



Фота Аляксандра СКІБЫ.

Актрыса Таццяна ЧАРДЫНЦАВА:

«Працуючы, не думаю, як быць у кадры прыгожай»

Ці змаглі б вы з'есці вока барана? А здымацца ў паўночную завіруху на заледзянелым возеры? Сапраўды, прафесія акцёра часам вымагае не толькі майстэрства, устойлівасці да стрэсаў, уменння пераносіць доўгія пераезды і пералёты, але і гатоўнасці да экстрэмальных сітуацый. Бо ніколі не ведаеш, якую ролю прапануюць сыграць у наступным фільме ці серыяле, які выклік — найперш сабе — давядзецца кінуць заўтра. Наша сённяшняя гераіня выдатна знаёмая з усімі цікавінкамі і «наступствамі» прафесіі. Знаёмцеся: Таццяна Чардынцава — беларуская актрыса тэатра і кіно, вядомая шырокай публіцы па ролях у такіх серыялах, як «Смерць шпіёнам. Ударная хваля», «Печыва з прадказаннем», «Чырвоная каралева». Мы гутарым з Таццянай пра важнасць творчай школы, уменне прымаць розныя погляды і талент заўсёды трымаць сябе ў форме.

— Таццяна, твая фільмаграфія налічвае больш як семдзясят карцін... Як табе ўдаецца ўсё паспяваць пры такім шчыльным графіку?

— Нічога складанага ў гэтым няма, калі займаешся любімай справай. Нехта любіць хадзіць на шопінг, нехта ў кіно, хтосьці — пісаць карціны, вершы... Мне падабаецца займацца тым, што я раблю. Яшчэ з дзяцінства мяне зацікавіў дзівосны свет творчасці. Памятаю, наведвала неверагодную колькасць гурткоў і студый, музычную школу па класе фартэпіяна, мастацкую школу, а потым і тэатральную... Гэта навучыла мяне правільна планаваць час і загартавала характар.

